—

Дата правядзення экзамену: 15 чэрвеня 2016 года

Час выканання работы: 45 хвілін

**Тэкст дыктанта і граматычнае задание**

**для правядзення ўступнага экзамену**

**ў 10 клас лщэя**

Дыктант

Лясныя сцежкі... Яны заўсёды прыемныя і загадкавыя, а часам нават таямнічыя. Не кожнаму паказвае лес дарогу да сваіх патаемных скарбонак. Усё залежыць ад чалавека. Ідзе адзін і нічога асаблівага вакол сябе не заўважае. Дрэвы як дрэвы, трава як трава. А другі, ідучы той жа сцежкай, убачыць куды больш. Толькі трэба прыгледзецца ўважлівей, і яму ахвотна раскрые лес сваю душу.

Назіраючы за тым, што адбываецца вакол, чалавек заўважае шмат. І вавёрку, што прытаілася на суку. І выбітыя на бярозцы маленькія дзірачкі, з якіх ласуецца салодкім сокам дзяцел. А гляне на мурашнік - вызначыць надвор'е на бліжэйшы час. Тонкі назіральнік, ён разумее, ад чаго гучна застагнала старая хваіна, чаму схіліліся галінкі стромкай яліны. Ён дакладна вызначыць, хто гэтак гучна пракрычаў дзесьці ў самым зарасніку.

Чалавек разумее лес, і лес разумее яго. Напоіць сокам і схавае ад дажджу, дасць адпачыць у прахалодзе дрэў і накорміцьляснымі дарамі-ласункамі (145 слоў)

*Паводле В.Грамыкг.*

Граматычнае задание

1. Выпішыце з тэксту фразеалагізм, пісьмова патлумачце яго значэнне.
2. Выпішыце з тэксту тры словы, вымаўленне і напісанне якіх не супадае. Пісьмова патлумачце, чым абумоўлена гэта несупадзенне.
3. Выпішыце з тэксту складаназалежны сказ з некалькімі даданымі часткамі і зрабіце яго сінтаксічны разбор.